УДК 82:1:821.1/.9:821.161.3

**Т. М. Федарцова**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ПРАБЛЕМА АДЧУЖЭННЯ Ў СУСВЕТНАЙ І БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У артыкуле разглядаецца сутнасць філасофскага паняцця «адчужэнне» ў кантэксце праблематыкі сусветнай і беларускай літаратуры. Змяненне гуманістычных ідэалаў і патэнцыялу сучаснай культуры прывялі грамадства да антрапалагічнага крызісу, заўважанага філасофамі яшчэ ў канцы XIX–XX стст. Ён прымусіў філасофію, а за ёй і літаратуру, якая з эпохі Барока пастаянна сілкуецца набыткамі філасофскай думкі, шукаць першапрычыны падобных абставінаў. Літаратуразнаўцы, пісьменнікі, паэты, драматургі актыўна пачалі не толькі знаёміцца з працамі Зігмунда Фрэйда, Фрыдрыха Ніцшэ, Эрыха Фрома, але і выкарыстоўваць іх вучэнні, сутнасць якіх яны, таксама як і філасофы, бачаць у сінтэзе сацыяльнага, біялагічнага і псіхалагічнага аспектаў, у стварэнні цэлай галерэі літаратурных вобразаў, як носьбітаў у першаю чаргу маральнага адчужэння, і распрацоўцы па зададзенай схеме характараў герояў сваіх твораў. З «разбажаствленнем» свету знікаюць многія ранейшыя законы, з'яўляецца адчуванне бязмежнай свабоды. Але згодна з высновамі Э. Фрома, прыведзенымі ў артыкуле «Бегство от свободы», толькі высокамаральная асоба разумее катэгарычную розніцу ў паняццях «свабода ад…» і «свабода для…».

У грамадстве з рынкавымі адносінамі маральнасць страчвае свой пануючы стан, бо рушацца векавыя традыцыі, іншае гучанне набывае канфлікт пакаленняў, і тут трэба аддаць належнае Эрыху Фрому ў распрацоўцы механізмаў паняццяў «адчужэнне» і «самаадчужэнне», якія з'явіліся ў выніку «рынкавай арыентацыі». Бо чалавек пачаў разглядаць свае сілы як тавар, што існуе свабодна ад яго, не належыць яму, таму што для яго зараз мае сэнс не працэс самарэалізацыі з дапамогай гэтых сіл, не здзяйсненне сваіх сапраўдных здольнасцей, а выгадны іх продаж, чым і вызначаецца далейшы поспех. Пісьменнікі (постмадэрністы ў першую чаргу) заўважылі, што ў дадзенай сітуацыі ўнікальнасць чалавечай асобы страчвае свой сапраўдны кошт і сваю непаўторнасць. Пачынаецца маральнае адчужэнне.

**Ключавыя словы:** адчужэнне, маральнасць, раз'яднанасць, аспект, сінтэз, сацыяльныя фактары, класічны псіхааналіз, памежная сітуацыя, адзінота, дэструкцыя, тэкст, канцэпт, парадыгма.

**T. M. Fedartsova**
Belarusian State Technological University

# THE PROBLEM OF ALIENATION IN THE WORLD AND BELARUSIAN LITERATURE

The essence of the philosophical concept of “alienation” in the context of the problems of world and Belarusian literature is discussing in the article. Changing of humanistic ideals and potential of modern culture led society to anthropological crisis. Which was seen by philosophers at the end of XIX–XX. Crisis forced philosophy and then literature, to look for root causes of the similar circumstances.

Literary critics, writers, poets, playwrights have actively begun to get acquainted with the works of Sigmund Freud, Friedrich Nietzsche, Erich Fromma. They also have begun to use the teachings of these scientists. The essence of their teachings literary critics, writers, poets, playwrights saw, as well as philosophers, in the synthesis of social, biological and psychological aspects, in the creation of a gallery of literary images and the development of the given scheme of the characters of his works. Which carried firstly moral alienation. Many infallible laws disappeared with the “deification” of the world, a feeling of boundless freedom appeared. But in accordance with the findings E. Fromm, which were given in the article “Escape from the freedom”, only a moral person recognizes a categorical difference in terms of “freedom from...” and “freedom for...”.

In a society with market relations morality loses its dominant importance, because it destroys the age-old traditions. a conflict of generations acquires the otherwise sound, and here we must pay tribute Erich Fromm in the development of mechanisms concepts of “alienation” and “self-alienation”„ which was the result of “market orientation”. For this reason, man began to consider his power as a commodity that exists freely from him, but not belong him. Because not the process of self-realization with the help of these forces, not a valid exercise of their abilities,but their best selling makes now sense for him. What determines a further success. Writers (postmodernists in the first place) noticed that in this situation uniqueness of the human person loses its actual price and its originality. The moral alienation starts .

**Key words:** alienation, morality, separation, dimension, synthesis, social factors, classical psychoanalysis, the boundary situation, the loneliness, the destruction, the text, concept, paradigm.

**Уводзіны.** Праблема адчужэння – з'ява даволі актуальная і супярэчлівая ў сучасным літаратурным працэсе, які сёння шчодра сілкуецца набыткамі філасофіі, і не толькі ў гэтым кірунку. Асабліва ўрадлівай глебай для стварэння новых, нязнаных раней літаратурных вобразаў з'яўляецца аспект маральнага адчужэння [1]. Бо ўсведамленне маральнасці, як аднаго з галоўных спосабаў быцця чалавека, заключаецца ў тым, што высокамаральная асоба ўтрымлівае ў сабе найважнейшыя кампаненты духоўнасці – гэта еднасць высокаінтэлектуальных, эстэтычных і маральных сіл кожнай асобы, індывідуальная патрэба ў іх пастаянным развіцці, папаўненні, задавальненні і творчым пошуку, якія не даюць магчымасці адчуваць сябе непатрэбным не толькі грамадству, але і самаму сабе [2]. А калі ўзмацняюцца супярэчнасці паміж маральным прызначэннем чалавека і яго сапраўдным жыццём, дзеяннямі, яго ўчынкамі, пачынаецца разлад асобы, ідзе ўнутранае яе разбурэнне, таму і ўзрастае непазбежнасць маральнага адчужэння. Асноўная мэта даследавання заключаецца ў разглядзе асаблівасцей філасофскага паняцця «адчужэнне» для літаратурнага працэсу.

**Асноўная частка.** Вобраз адзіноты даволі не новы для ўсяго сусветнага літаратурнага працэсу. Да Вікторыі і Юханеса (раман Кнута Гамсуна «Вікторыя») адзінота ўпарта прыходзіць з-за сутыкненняў характараў, а не з-за неспрыяльных абставінаў, шматлікіх прадстаўнікоў роду Буэндзіа (раман Габрыэля Гарсія Маркеса «Сто год адзіноты») з нагоды абыякавасці адзін да аднаго ўсіх членаў сям'і, адсутнасці агульных намаганняў нешта здзейсніць разам, разумець сваіх блізкіх і клапаціцца пра іх.

Вядомы французскі пісьменнік, драматург, публіцыст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Франсуа Шарль Марыяк, стварыўшы яркі вобраз «сям'і-клеткі» ў рамане «Клубок змей», з усіх бакоў паказвае, да чаго прыводзіць «раз'яднаная незалежнасць». Аповед вядзецца ў выглядзе дзённіка старога Луі, што падвышае давер чытача да сказанага. Луі пражыў вялікае жыццё са сваёй жонкай Ізай без асаблівых разыходжанняў у меркаваннях, быццам бы ціха і мірна. І раптам называе яго «доўгай эрай вялікага маўчання». Бо на працягу ўсяго сямейнага жыцця не асмеліўся ні разу шчыра выказаць свае думкі, выявіць пратэст супраць таго, з чым у душы і думках не пагаджаўся. Марыяк такі стан свайго героя называе «стратай уласнага "Я"». Пасутнасці, маючы пэўныя жыццёвыя пераканані, Луі пражыў не сваё жыццё, бо ён ніколі і не быў самім сабой, а існаваў як цень свёй уладарнай жонкі. Франсуа Марыяк, разважаючы над вытокамі маральнага адчужэння і самаадчужэння свайго героя, выводзіць чытача на больш глыбінныя філасофскія аспекты, такія як страта традыцыйных каштоўнасцей, абясцэньванне гуманістычнага патэнцыялу грамадства.

Нямецка-амерыканскі ж філосаф, сацыёлаг і псіхолаг Э. Фром, адзін з вядучых прадстаўнікоў неафрэйдызму, у працы «Бегство от свободы» такую пазіцыю «самаадчужанасці» далучае да дэструктыўных і на пытанне, хто ж у гэтым вінаваты, адказвае адназначна: сам чалавек. Бо і Луі разумее, што ён мог змяніць сваё жыццё, пабудаваць адносіны ў зусім іншым рэчышчы, але не хапала рашучасці і смеласці. Выходзіць, што прычына бегства чалавека ад самога сябе, ад уласнай свабоды ўзнікае з-за абыякавасці індывідыума да сябе ў першую чаргу.

Выкарыстоўваючы вучэнне Фрома для стварэння галерэі мастацкіх вобразаў, Франсуа Шарль Марыяк не быў адназначным у сваіх меркаваннях. Так, у рамане «Дарога ў нікуды», напісаным у 1939 г., пісьменнік стварае вобраз героя-ахвяры, які перажывае адчужанасць у грамадстве, і ставіць яго перад выбарам: рэвалюцыйная дзейнасць ці служэнне Богу. Але рэвалюцыянер – гэта бунтар, здольны на ломку старых устояў, традыцый, законаў, а служэнне Богу патрабуе пакорлівасці, самапаглыбленасці, паслушэнства і бездакорнага прызнання догмаў. Адзінае, што сапраўды яднае гэтыя выразныя супрацілегласці, – гэта самаахвярнасць. І ў першым, і ў другім выпадку такая рыса павінна абавязкова прысутнічаць у характары героя.

Безумоўна, актыўна працягваючы традыцыі, закладзеныя А. дэ Бальзакам і Э. Заля, пісьменнік даследуе тонкія нюансы чалавечай псіхалогіі. У цэнтры большасці яго твораў – адносіны ў сям'і. Жыццё пастаянна выпрабоўвае герояў Марыяка на трываласць, і мала хто з іх з гонарам вытрымлівае гэта выпрабаванне. Таму аўтар стварыў свой асобы, марыякаўскі, тып сацыяльнага рамана: «сям'я-клетка», «сям'я-прывід», «сям'я-пустыня» і г. д.

Некаторыя раманы Марыяка амаль не выходзяць за межы сацыяльна-псіхалагічнага даследавання, у прыватнасці гэта «Дзіця пад цяжарам ланцугоў», «Патрыцыянская тога», «Тэрэза Дэскейру», «Пустыня любві». У іх паказана, як і чаму прыходзіць да людзей адзінота. Спусташэнне душы Раймана Куража – героя рамана «Пустыня любві» – пачынаецца з няўвагі і раўнадушша да блізкіх людзей. Гэту драму чалавечага жыцця не можа аздобіць нават «каханне-ўспышка» да Марыі Крос. Раймана лічаць наказаннем сям'і, бо ён фактычна не ўмее і не жадае нікому падпарадкоўвацца, ніколі не дазваляе сабе пакутваць за іншага чалавека, суперажываць яму, пагардліва ставіцца да родзічаў і сваякоў. І нават калі бацьку хацелася пагаварыць з ім шчыра і

даверліва, сын не жадаў перапыняць маўчанне і адчужанасці. І ў той жа час яму ў глыбіні душы хацелася, каб яго шчыра любілі. І калі старэйшая сястра Мадлена Баск і яе муж нават не звярнулі ўвагу на яго прыход у дом і працягвалі гладзіць сабаку, Райман у роспачы падумаў: «Я для яе значу меней за сабаку» [3].

Марыяк лічыць, што ўсе камунікатыўныя зносіны сапсаваны раўнадушшам. Пустыняй уяўляецца не толькі даволі рэспектабельны дом Куражаў, але і ўвесь сусвет, які атачае жыхароў гэтага дома, заселенага адзінокімі людзьмі. І не псіхалагічная несумяшчальнасць раз’ядноўвае іх, а адсутнасць якіх-небудзь станоўчых пачуццяў адзін да аднаго: паспяховага ўрача, цярплівага і ўважлівага да сваіх пацыентаў Поля Куража раздражняе прысутнасць жонкі Люсі, а ён у сваю чаргу раздражняе некалі горача любімую дачку Мадлену і каханую ім жанчыну Марыю Крос, якая ў яго прысутнасці адчувае толькі сум і роспач. Райман раздражняе ўсіх. І толькі любоў і каханне могуць ператварыць гэту пустыню ў квітнеючы аазіс. Але шчырых пачуццяў няма. Глыбокае адчужэнне ў сям’і напамінае мёртвую дарогу, якая нікуды не вядзе. Героі твора знаходзяцца ў стане псеўдаагрэсіі адзін да аднаго, бо здзяйсняюць неабдуманыя дзеянні, у выніку якіх можа быць нанесена шкода [4].

Герой рамана «Млоснасць» французскага філосафа Жан-Поля Сартра Антуан Ракантэн свядома ізаляваў сябе ад людзей і пакутуе ад адзіноты, не жадаючы парушыць усталяваны стан млоснасці пошукамі ці аднадумцаў, ці субяседнікаў, бо інакш, на яго думку, ён страціць бязмежную свабоду [5].

Імкненне да асабістай свабоды, уласнай прасторы, часовай адзіноты ў разумных дозах чалавеку не шкодныя. Калі аўтар «ізалюе» Ракантэна ў бібліятэцы для напісання кнігі пра жыццё маркіза дэ Ральбанэ, то герой не адчувае сябе ні самотным, ні адвергнутым ад грамадства. Перанасычаны новымі ўражаннямі і знаёмствамі пасля працяглай вандроўкі па-за межамі роднай Францыі, Антуан з радасцю адасабляецца, бо справа, за якую ён бярэцца з такім жаданнем і ахвотай, патрабуе ўдумлівасці і засяроджанасці. А бібліятэка, як сукупнасць агульнага чалавечага розуму, павінна была паспрыяць плённаму здзяйсненню творчых задумак нашага героя. Яго захапіла праца, і толькі расчараванне ў ёй пераходзіць пэўную мяжу незалежнасці ад іншых. Думка пра адзіноту ў яго мяжуе з напамінкам пра смерць. Яшчэ больш, смерць уяўляецца часам настолькі абсалютнай свабодай, што хочацца без ваганняў кінуцца ў яе абдымкі.

Улада млоснасці – гэта новы матыў, новая тэма філасофскай прозы. Жан-Поль Сартр выводзіць тыповага для экзістэнцыялізму героя, што існуе па-за сацыяльнымі сувязямі і па-за маральнымі абавязкамі і імкнецца да поўнай адзіноты і абсалютнай свабоды. Сартр будуе свой аповед у выглядзе дзённіка вучонага Антуана Ракантэна, чым пацвярджае шчырае імкненне разабрацца ў стане душы і ўспрыйманні жыцця свайго сучасніка, які ўпэўнены, што смерць не натуральны стан чалавека, але і жыццё ўяўляецца як абсурдны фарс. Такі новы вобраз у літаратуры цікавы глыбінёй філасофскага аўтарскага даследавання і паказу жыцця «ў сабе», абвяшчэння свабоды ад грамадства і бессэнсоўнага свету. Сартр-філосаф лічыць, што, такім чынам, і адказнасць за адпаведны выбар цалкам кладзецца на дадзенага героя. А ці здольны ён несці гэту адказнасць па-за сацыяльнай адказнасцю?

Калі ўважліва прааналізаваць паводзіны Мерсо – галоўнага героя рамана «Чужаніца» французскага пісьменніка і філосафа Альбера Камю, то зразумелай стане развага перакладчыка яго творчасці на беларускую мову Зміцера Коласа: Ці не відазмяніў французскі мысляр экзістэнцыялізму вечнае пытанне пра сэнс жыцця? Бо пад пагрозай існавання знаходзяцца традыцыйная эстэтыка і традыцыйная грамадская мараль. А калі гэтыя каштоўнасці несапраўдныя для цэлага пакалення? Яму ў спадчыну дастаюцца адчужанасць ад грамадства эгацэнтрычнымі па-сутнасці ідэямі, раз’яднанне ў самім сабе, так званая ўнутраная ізаляцыя – гэта непазбежны вынік злачынства Мерсо. Таму, што гэта не бунт незвычайнай асобы, такой, як Раскольнікаў у рамане Фёдара Дастаеўскага «Злачынства і пакаранне», які дакладна рыхтаваў забойства. Мерсо здзяйсняе яго стыхійна. Ужо ў яго імені зашыфраваны словы «смерць» і «сонца». І вось у спякотны дзень на пляжы ён забівае чалавека, які нічога яму не зрабіў і нават не быў з ім знаёмы.

Ахрысціўшы свайго героя «чужаніцай», аўтар паказвае яго неўспрыманне традыцый, рытуалаў, дзяржаўных і грамадскіх законаў, думак, меркаванняў, асуджэнняў і інш.

Мерсо абыякавы да жыцця. Яго нішто не цікавіць акрамя ўласнага існавання. Адзінае, у чым ён упэўнены, што хутка прыйдзе да яго смерць, і ён заключае: «Што мне да смерці іншых, што мне да матчынай любві, да ягонага Бога (*мае на ўвазе святара)*, да жыцця і лёсу, які людзі нібыта самі сабе выбіраюць, калі ёсць толькі адзін лёс, адзін, і ён сам абірае мяне і, разам са мной, мільярды іншых выбраннікаў» [6].

Каб падкрэсліць галоўныя прычыны антрапалагічнага крызісу, Габрыэль Гарсія Маркес дэманструе страту даверу да будучыні праз

знішчэнне роду Буэндзіа. Сто год адзіноты (а гэта чатыры пакаленні) не навучылі мудрасці быць не толькі побач, але і разам. Здаецца, што «эра вялікага маўчання» паміж Урсулай і Хасэ Аркадзіа пануе і ў гэтым творы. Мы не бачым іх сумеснай працы, абмену думкамі, няма і высвятлення адносінаў, але, у адрозненне ад Луі і Ізы, у кожнага з Маркесаўскіх герояў ёсць невычэрпная асабістая свабода. Урсула, напрыклад, даволі спакойна адносіцца да ўсіх творчых пачынанняў свайго мужа і нават не патрабуе ад яго дапамогі ў такіх «не жаночых» справах, як будоўля. А Хасэ Аркадзіа не перашкаджае жонцы даводзіць яе апантаныя задумкі да лагічнага завяршэння. Да таго ж, у адрозненне ад Луі, Урсула і Хасэ Аркадзіа – асобы дзейсныя, няўрымслівыя, схільныя да здаровага авантурызму. Але знешняя свабода не скасоўвае ўнутранай адзіноты, хаця галоўны герой і здольны пакуль яшчэ рабіць нешта для агульнай справы, бо ў час ліхаманкі забыцця, калі жыхары Макондa нават не пазнавалі адзін аднаго і сноўдалі міма, як маўклівыя цені, галоўны герой Хасэ Аркадзіа Буэндзіа пачаў падпісваць хатнія рэчы: «стол», «крэсла», «гадзіннік», «дзверы» і г. д., і рабіў ён гэта таму, што зразумеў жах наступства адзіноты: калі людзі не ўступаюць у маўленчы працэс адзін з адным, назвы рэчаў могуць забыцца, а яшчэ горш, што «может наступить день, когда, знакомясь с вещами по названиям, не будешь знать, для чего они предназначены. Тогда он стал давать краткие, но доходчивые объяснения» [7].

Але калі тэма адчужэння ў сусветнай літаратуры разглядаецца шматпланава, то ў беларускай яна ледзьве абазначана. Так, Мікола Мятліцкі, напрыклад, адзін з нямногіх творцаў, хто таленавіта паказвае працэс адчужэння ад грамадства і звычаёвага ўкладу жыцця беларусаў у вершы «Пан Юзаф».

Чалавек, які ў маладосці выбраў не зусім правільны шлях, збег некалі са сваёй краіны, пакінуўшы бацькоў, жонку, дзяцей, на чужыне завёў новую сям'ю, але хворым старым вяртаецца на малую радзіму. Ды толькі тут чакае яго адзінота: бацькі памерлі, вёска адселена… І напаўняе сэрца шчымлівая самота:

Ужо праменьчык зоркі ў небнай вышы
Праліўся. І апошняе святло
У цені сосен Віліяй плыло.
Ён здрыгануўся. Ў першабытнай цішы
Адзін – нікога побач не было [8].

Толькі герой дадзенага верша вінаваты сам у тым, што так сталася. Аднавяскоўцы ж паэта да дна выпілі чашу гора і слёз і пакутна панеслі свой чарнобыльскі крыж на Галгофу жыцця па чужой волі. У кнізе выбранай паэзіі «Чаканне сонца» аўтар падзяляе сваю творчасць на два перыяды: дачарнобыльскі і паслячарнобыльскі. Гэта мяжа прайшла праз яго сэрца, бо грознае ліха адабрала малую радзіму. Згубіўшы галоўнае апірышча, мы становімся самотнымі, бо выразна разумеем, што такое адзінота.

Але калі ўсе названыя вышэй прычыны адзіноты, прыведзеныя з твораў сусветнай літаратуры, маглі б быць лёгка скасаванымі самімі людзьмі пры іх жаданні, то як быць нашаму аўтару і яго аднавяскоўцам, і ўсім тым, хто па волі злога лёсу і чалавечай неабачлівасці раптам стаў выгнанцам з родных мясцін, калі малая радзіма страціла свае пяшчотныя, дарагія з дзяцінства найменні і яны ператварыліся ў адно змрочнае цэлае – «зону адчужэння». Напрыклад, у адным са сваіх прысвячэнняў Аркадзю Куляшову беларускі паэт Юрась Свірка трапна заўважыў, што чарнобыльская навала, якая закранула вёску Саматэвічы – малую радзіму старэйшага сабрата па пяру, – гэта і ёсць антысвет жыццярадаснага, сцвярджальнага свету паэта:

І не пачуецца нідзе
Ні песні нашае, ні слова,
Па Саматэвічах брыдзе
Свет не Аркадзя Куляшова [9].

Так і родныя мясціны Міколы Мятліцкага і многіх іншых паэтаў ператварыліся ў зону смерці. А яе былыя жыхары зведалі горыч выгнання, стаўшы за адну ноч бесхацінцамі, пра што з болем піша творца ў сваім вершы «Кут мой забыты, безабаронна…». У прымусова пакінутым Бабчыне на сталае жыхарства засталася толькі адна дзеючая асоба – адзінота. Гэты вобраз стане скразным у яго паэтычных зборніках «Чаканне сонца», «Горкі вырай», «Бабчын: Кніга жыцця», «Хойніцкі сшытак». З гэтага часу набатам загучыць узрушанае слова Максіма Танка, Сяргея Законнікава, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Янкі Сіпакова, народжанае асабістай і агульнай бядой, што напоўніла іх чарнобыльскія вершы балючай праўдай пра трагедыю Беларусі.

Перад паэтамі таксама ўзнікае рытарычнае пытанне: як жыць, згубіўшы апірышча, якім заўсёды была малая радзіма? Паэтычнае слова творцаў становіцца горкім і няўцешным…

Калі ўзяць пад увагу тую акалічнасць, што тэма адзіноты стала вызначальнай для сусветнай літаратуры XX ст., то дзіўнага ў яе з'яўленні ў творчасці беларускіх аўтараў мала, бо цалкам ізаляваць творчасць ад агульных сусветных тэндэнцый немагчыма. Іншая справа, што тэма маральнага адчужэння не магла развіцца на беларускай глебе з нагоды таго, што талерантны народ не згубіў пакуль што сваіх традыцый і звычаяў. Яшчэ ўмее працаваць «талакой», а значыць разам. Паслаблены, але не парушаны радавыя сувязі. Не зніклі сяброўскія і добрасу-

седскія адносіны, беларусы не развучыліся працаваць, і многім праца прыносіць творчую радасць. Ды і агульных бед і выпрабаванняў у беларусаў было больш, чым у іншых народаў, ім сам лёс дыктаваў трымацца разам.

**Заключэнне.** Такім чынам, згодна з вучэннем Э. Фрома, у сусветнай літаратуры мы назіраем змяненне чалавечых адносінаў, у якіх на змену глыбокай любві ці варожаці заступаюць абыякавасць і эгаістычнае жаданне выкарыстаць кагосьці ў сваіх інтарэсах.

Наступны аспект адчужэння: адносіны чалавека да самога сябе. Чалавек страчвае сваё «Я», сваю асабістую ўнікальнасць, свой асабісты патэнцыял, калі адчужаецца ад дзяржавы і грамадства. З'яўляецца здольнасць да хуткага прыстасавання, пастаяннай гатоўнасці мяняцца, падладжвацца пад абставіны, жадаць бязмежнай свабоды без адказнасці, а не вырашаць наспелыя праблемы.

Адчужэнне чалавека ад чалавека, на думку Э. Фрома, прыводзіць да страты ўсеагульных і сацыяльных сувязей, таму людзі трымаюцца разам з эгаістычнай мэтай выкарыстоўваць адзін аднаго, што дасканала паказана ў рамане Франсуа Марыяка «Пустыня любві».

У беларускай літаратуры тэма маральнага адчужэння не развілася ў тым рэчышчы, як гэта паказана ў сусветным літаратурным працэсе. Бо яшчэ існуе моцная сувязь асобы з грамадствам праз сям'ю, працоўны калектыў, сяброўскія адносіны, добрасуседства і інш. Але тэме адзіноты прысвечана шмат твораў, якія звязаны з Чарнобыльскай трагедыяй. Кожны аўтар гэту задачу вырашае з дапамогай індывідуальных мастацкіх прыёмаў. Але галоўная думка пра тое, што беларусы справіліся з немагчымым – выжылі! Яны не адступілі перад навалай, не здаліся, і зноў чуецца дзіцячы смех там, дзе, здавалася б, яго не магло і быць. І зрабілі яны гэта супольна.

## Літаратура


1. Гароди Р. О. О понятии «отчуждение» // Вопросы философии. 1959. № 8. С. 56–64.
2. Костин А. А. Отчуждение мнимое и реальное // Социологические исследования. 1998. № 2. С. 67.
3. Мориак Франсуа. Пустыня любви. М.: Борисфен, 1995. 462 с.
4. Фром Э. Анатомия человеческой деструктивности. Минск: ООО «Попурри», 1999. 624 с.
5. Андреев Л. Г. Жан-Поль Сартр: свободное сознание и XX век. М.: Гелеос, 2004. 415 с.
6. Камю А. Выбраныя творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. 430 с.
7. Маркес Г. Г. Сто лет одиночества. Ростов-на-Дону: Феникс, 1999. 352 с.
8. Мятліцкі М. Кросны // Полымя. 1998. № 8. С. 31–36.
9. Свірка Юрась. У Зоне // Полымя. 1996. № 12. С. 5.


## References


1. Garodi P. O. On the concept «alienation». *Voprosy filosofii* [Problems of Philophy], 1959, no 8, pp. 56–64 (In Russian).
2. Kostin A. A. Alienation, imaginary and real. *Sotsiologicheskiye issledovaniya* [Sociological investigations], 1998, no 2, p. 67 (In Russian).
3. Moriyak Fransya. *Pustynya lyubvi* [Desert of love]. Moscow, Borisfen Publ., 1995. 462 p.
4. Fromm E. *Anatomiya chelovecheskoy destruktivnosti* [Anatomi of human destructiveness]. Minsk, OOO "Popurri" Publ., 1999. 624 p.
5. Andreev L. G. *Zhan-Pol' Sartr: svobodnoye soznaniye i XX vek* [Jean-Paul Sartre: Free consciousness]. Moscow, Geleos Publ., 2004. 415 p.
6. Kamyu A. *Vybranyya tvory* [Selected worcs]. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 2005. 430 p.
7. Markes G. G. *Sto let odinochestva* [One hundred Years of Solitude]. Rostov-on-Don, Feniks Publ., 1999. 352 p.
8. Myatlitski M. Krosno. *Polymya* [Fire], 1998, no 8, pp. 31–36 (In Belarusian).
9. Svirka Yuras'. In a sone. *Polymya* [Fire], 1996, no. 12, p. 5 (In Belarusian).


## Інфармацыя пра аўтара


**Федарцова Тамара Мікалаеўна** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: Fedortsova@belstu.by


## Information about the author


**Fedartsova Tamara Mikalaeuna** – PhD (Philology), Assistant Professor, the Department of Belarusian Philology. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: Fedortsova@belstu.by


*Паступіў 27.02.2018*